Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 94 (476) «1921/1939»

# СПРОБЫ ПАЛАНІЗАЦЫІ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ І БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ МОЛАДЗІ Ў МІЖВАЕННАЙ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ

**Крывуць Віталій Іванавіч**
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Баранавічы, Беларусь)

*Даклад прысвечаны аналізу палітыкі польскіх улад адносна праваслаўнай царквы і праваслаўнай моладзі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Характарызуецца канфесійны склад насельніцтва рэгіёна і спробы паланізацыі мясцовага*

*праваслаўя. Таксама паказана паланізацыйная дзейнасць, якая была накіравана на праваслаўную беларускую моладзь у школе і польскай арміі.*

У міжваенны перыяд моладзь складала каля 20% ад усяго насельніцтва Заходняй Беларусі, якая ў той час уваходзіла ў склад польскай міжваеннай дзяржавы. Што да канфесійнага складу маладога пакалення заходнебеларускіх ваяводстваў Польшчы, то тут можна экстрапаліраваць дадзеныя аб канфесійным складзе ўсяго насельніцтва рэгіёну. Вядома, што ў 1930-я гг. у Беластоцкім ваяводстве 58,6% насельніцтва складалі каталікі, 16,1% – праваслаўныя, 14,7% – іудзеі, 1,6% – прадстаўнікі іншых канфесій. У Віленскім ваяводстве 61,2% жыхароў былі каталікамі, 26,8% – праваслаўнымі, 9,4% – іудзеямі, 2,6% адносіліся да іншых канфесій. 51,2% насельніцтва Навагрудскага ваяводства з'яўляліся праваслаўнымі, 39,5% – каталікамі, 9,0% – іудзеямі і толькі 0,3% належалі да іншых канфесій. У Палескім ваяводстве працэнт праваслаўных сярод насельніцтва быў самым высокім – 79, 2%. Таксама тут пражывала 7,8% каталікоў, 12,6% іудзеяў, 0,4% насельніцтва адносілася да іншых рэлігійных груп [1, с. 31 – 32]. Такім чынам, праваслаўная моладзь павінна была складаць значную частку маладога пакалення рэгіёна.

Міжваенныя гады сталі дастаткова складаным перыядам для праваслаўя на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Рыжскі мірны дагавор (18 сакавіка 1921 г.) прадугледжваў, што польская дзяржава гарантуе рускім, украінцам і беларусам, якія жылі ў Польшчы, усе правы, у тым ліку і свабоднае адпраўленне рэлігійных абрадаў. Акрамя таго бакі, якія падпісалі дамову, дамовіліся не ўмешвацца ў жыццё рэлігійных арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншай дзяржавы. На думку польскіх уладаў, гэтыя пункты пагаднення давалі ім права кантролю над праваслаўнай царквой і магчымасць зрабіць яе аўтакефальнай. Пастанова аб аўтакефаліі была прынята на Саборы біскупаў у Варшаве ў 1922 г. Царква стала называцца «Польская Аўтакефальная Праваслаўная Царква» (ПАПЦ). Пазней аўтакефалія была зацверджана Канстанцінопальскім Патрыярхам і афіцыйна абвешчана 17 верасня 1925 г. [2, с. 523 – 524].

Неабходна адзначыць, што ў міжваеннай польскай дзяржаве не існавала асобнай арганізацыі праваслаўнай моладзі. Гэтым праваслаўная царква сур'ёзна адрознівалася ад рымска-каталіцкай, пры якой актыўна дзейнічаў Саюз польскай моладзі (СПМ), першыя гурткі якога з'явіліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1926 г. Але пры гэтым сваю "апеку" над праваслаўнымі беларусамі спрабавалі распаўсюдзіць польскія праўрадавыя арганізацыі – Стралецкі саюз «Стралец», Саюз сельскай моладзі – Саюз маладой вёскі (ССМ – СМД), Арганізацыя працоўнай моладзі і шэраг іншых. Напрыклад, у 1933 г. у Ашмянскім павеце членамі гурткоў ССМ з'яўляліся 499 каталікоў і 123 праваслаўных [3, с. 6].

Тым не менш, заставаліся яшчэ дзве сферы за межамі сцен храмаў, дзе праваслаўнае духавенства мела магчымасць узаемадзейнічаць са сваімі маладымі прыхаджанамі. Гэта былі школа і войска. Ва ўсіх навучальных установах Польшчы (за выключэннем ВНУ), якія ўтрымліваліся за кошт дзяржавы або мясцовага самакіравання, абавязковай была катэхізацыя – навучанне асновам рэлігіі. Гэта адносілася да ўсіх галоўных канфесій міжваеннай польскай дзяржавы: каталіцкай, праваслаўнай, іудзейскай, мусульманскай, пратэстанцкай [2, с. 540].

У Войску Польскім існаваў інстытут вайсковых капеланаў, у тым ліку і для прадстаўнікоў некаталіцкага веравызнання. Вядома, што праваслаўныя былі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

другой па колькасці вернікаў канфесійнай групай у польскай арміі. Аснову гэтай групы складалі менавіта беларусы. У 1924 г., нягледзячы на супраціўленне шэрагу чыноўнікаў і каталіцкага духавенства, былі выдадзены правілы арганізацыі пастырскай службы праваслаўнага веравызнання. У ліпені 1928 г. ваеннае міністэрства прыняло рашэнне аб тым, каб прызыўнікі розных канфесій прыносілі ваенную прысягу асобна. Тэкст прысягі адрозніваўся з улікам асаблівасцей рэлігійнага абраду [4, с. 90 – 91].

Польскія ўлады разумелі важнасць абедзвюх вышэйзгаданых сфер, у тым ліку і ў кантэксце правядзення дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Таму натуральна, што дзейнасць праваслаўнага духавенства ў школе і войску знаходзілася пад кантролем адпаведных структур кіраўніцтва сістэмы адукацыі і Войска Польскага. На працягу ўсяго міжваеннага перыяду польскія ўлады рабілі спробы рэфармавання царквы ў паланізатарскім духу. Ужо ў 1923 г. польскія чыноўнікі выказвалі перакананне, што з цягам часу пры адпаведнай палітыцы і пад уплывам польскай культуры праваслаўныя беларусы ператворацца ў “палякаў праваслаўнага веравызнання”. Дасягнуць пастаўленай мэты планавалася праз увядзенне ў царкоўнае справаводства, богаслужэнне, пропаведзі і навучанне рэлігіі польскай мовы, арганізацыю польскамоўнай праваслаўнай выдавецкай і культурна-асветніцкай дзейнасці, пераход царквы на Грыгарыянскі каляндар, стварэнне грамадска-рэлігійнага руху “праваслаўных палякаў”, прызначэнне на царкоўныя пасады святароў польскай нацыянальнасці. Асобна падкрэслівалася, што працэс паланізацыі праваслаўя павінен зыходзіць з войска [2, с. 533 – 534].

Часткай гэтай палітыкі павінны былі стаць і мерапрыемствы сярод беларускіх школьнікаў і прызыўнікоў-беларусаў. Аднак трэба прызнаць, што вялікіх дасягненняў у галіне паланізацыі маладых праваслаўных беларусаў у ходзе навучання асновам рэлігіі ў школе дасягнуць было немагчыма. Справа ў тым, што значная частка маладога пакалення Заходняй Беларусі ўвогуле не была ахоплена школьным навучаннем.

Больш паспяховай была сітуацыя ў Войску Польскім. Першыя праваслаўныя богаслужэнні на польскай мове пачаліся ў казармах у лістападзе 1935 г. У адной з дырэктыў ваеннага міністэрства (1938 г.) указвалася, што задачай ПАПЦ з’яўляецца як мага больш хуткая паланізацыя салдат-беларусаў. Вынікам дзейнасці праваслаўных капеланаў стала паступовае павелічэнне колькасці вайскоўцаў праваслаўнага веравызнання, якія называлі сябе палякамі.

Такім чынам, у міжваенны перыяд праваслаўная канфесія была адной з самых шматлікіх на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У сувязі з гэтым і маладыя праваслаўныя беларусы складалі значную частку маладога пакалення рэгіёна. Улады ўлічвалі гэта пры правядзенні сваёй палітыкі ў маладзёжным асяроддзі заходнебеларускіх ваяводстваў Польшчы. Яны ўзялі курс на ўвядзенне аўтакефаліі і паланізацыю праваслаўнай царквы. ПАПЦ павінна была стаць прыладай ператварэння праваслаўных беларусаў у «палякаў праваслаўнага веравызнання». Гэтаму павінна была садзейнічаць не толькі рэлігійная практыка, але і дзейнасць духавенства ў школе і арміі. Найбольшых поспехаў у гэтым напрамку ўдалося дасягнуць праваслаўным капеланам у Войску Польскім. Аднак трэба прызнаць, што палітыка паланізацыі праваслаўя і праваслаўных беларусаў на тэрыторыі паўночна-усходніх ўсходніх ваяводстваў не прынесла чаканых вынікаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. Ярмусик, Э. С. Католический Костёл в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939–1945) / Э. С. Ярмусик. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 240 с.

2. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921 – 1953 гг. В 2 кн. / А. А. Коваленя [и др.]. – Мн.: Беларуская навука, 2014. – Кн. 1. – 593 с.

3. Zew Młodzieży Wiejskiej. Jednodniówka ruchu młodowiejskiego pow. oszmiańskiego wydana z okazji istnienia 5-ciolecia oddziału powiatowego i 10-lecia Z.M.W. na terenie powiatu / Kom. red.: Z. Baranowiczówna, S. Skowroński, J. Dziewięcki. – Wilno: ZNICZ, 1933. – 16 s.

4. Грыбоўскі, Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918–1945 гадоў / Ю. Грыбоўскі. – Санкт-Пецярбург: Неўскі прасцяг, 2006. – 832 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова